Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 10. Варыянт 2**

**Білет 10. Практычнае заданне. Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці беларускага народа.**

**Заданне распрацавала:**Кульман В.Г., ДУА "Сярэдняя школа №35 г. Віцебска", Віцебская вобласць

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

1. Назавіце дату святкавання Дня Незалежнасці ў Рэспубліцы Беларусь.
2. Каму прысвечаны месцы ўвекавечання памяці аб Вялікай Айчыннай вайне?
3. Якім чынам у Рэспубліцы Беларусь захоўваецца памяць аб Вялікай Айчыннай вайне?
4. Як вы думаеце, навошта захоўваць памяць аб героях і ахвярах беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны?

**Крыніца І.**

**З выступлення Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі на цырымоніі ўскладання вянкоў да манумента Перамогі з нагоды 77-й гадавіны Вялікай Перамогі. 9 траўня 2022 г.**

Мы памятаем усіх, хто да апошняга патрона стрымліваў ворага на мяжы і ў Брэсцкай крэпасці, пад Мінскам і Магілёвам, хто быў закатаваны ў засценках гестапа, хто згарэў у Хатыні, Дальве і Трасцянцы. Усіх, чыёй крывёю прасякнута кожная пядзю нашай беларускай зямлі. Гора і смерць прынеслі свету гітлераўскія каты. Нас, беларусаў, рускіх, украінцаў, яны хацелі сцерці з зямлі, а заадно з намі яўрэяў, цыган, татараў і, на іх думку, іншых «недачалавекаў». Мільёны жыхароў паклала на алтар Перамогі нашая вялікая агульная радзіма – Савецкі Саюз. І восемдзесят мінулых гадоў не заглушылі гэты боль. Гонар і слава пераможцам! Вечная слава загінуўшым!

**Крыніца ІІ**

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Віншавальная паштоўка да Дня Незалежнасці Магілёўскага завода ліфтавага машынабудавання**




## III. Мемарыяльны комплекс "Шунеўка" ў Віцебскай вобласці

